

# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – базавая школа”**

Выпуск №5
Студзень 2020

# Правілы бяспекі

Навагоднія і калядныя святы - гэта заўсёды асаблівы і чароўны настрой не толькі ў дзяцей, але і ў дарослых. Але нават падчас святочнай весялосці не варта забываць пра бяспеку. Дарэчы, менавіта таму працаўнікі Міністэрства па надзвычайным сітуацыям Рэспублікі Беларусь праводзяць па ўсёй краіне акцыю "Бяспечны Новы год!». Каб доўгачаканыя святы не абярнулася трагедыяй, трэба ведаць і памятаць простыя рэкамендацыі ад выратавальнікаў. Больш падрабязна пра іх - у нашым матэрыяле.



# Навагодняя елка. Асноўныя правілы бяспекі




**1. Устаноўка.** Елка павінна стаяць на трывалай падставе і быць моцна замацаваная, каб яе не маглі зрушыць з места ні маленькія дзеці, ні кот, які раптам вырашыў пагуляць з упрыгожваннямі. Елку варта размясціць далей ад батарэй ацяплення і электрапрыбораў. Варта прадугледзець адлегласць і да дзіцячага ложачка - уначы аб'ёмны сілуэт дрэва можа спалохаць малога. Самае ўдалае месца - вугал удалечыні ад праходу. Там елка не будзе нікому перашкаджаць.

Пры такой меры бяспекі можна быць упэўненым - нават калі ёлка будзе закранутая падчас дзіцячай гульні, яна не ўпадзе і нікога не траўміруе. Побач з елкай нельга ставіць падсвечнікі са свечкамі. Любая неасцярожнасць можа прывесці да пажару.

**2. Упрыгожванне.** Не рабіце «снег» з ваты або любых іншых рэчываў ці прадметаў, якія лёгка ўзгараюцца. Няўдалае трапленне бенгальскага агню - і ўся канструкцыя загарыцца. Пры ўпрыгожванні навагодняй елкі не карыстайцеся свечкамі: адкрыты агонь можа стаць прывесці да пажара. Устрымайцеся ад самаробных цацак з лёгкагаручых матэрыялаў.

**3. Пра гірлянды і ілюмінацыю.** Гірлянда павінна быць якаснай, сертыфікаванай, бяспечнай, а яе ізаляцыя - шчыльнай, гнуткай і без знешніх пашкоджанняў, лямпачкі - зачыненымі. Месца пераключэння рэжымаў не павінна лёгка прагінацца. Стан гірлянды трэба праверыць загадзя перад тым, як яе вешаць, звярнуўшы асаблівую ўвагу на праблемныя месцы: злучэнне провада з лямпачкамі.

Упрыгожваючы елку, старайцеся не апускаць гірлянды блізка да пола, паколькі іх могуць зачапіць дзеці ці хатнія жывёлы. Ёлка з навагоднімі цацкамі і ўпрыгожваннямі можа перакуліцца. Таксама адно з важных правілаў - не пакідайце гірлянды ўключанымі на ноч або ў той час, калі дома нікога няма.

# Рэкамендацыі па бяспечнаму выкарыстанню піратэхнічных вырабаў




Як паказвае вопыт, прычынай трагедыі могуць стаць не столькі самі феерверкі, колькі недарэчнае і няўмелае іх выкарыстанне.

У навагоднюю ноч траўмы рознай ступені цяжкасці штогод атрымліваюць дзесяткі нашых грамадзян, гараць кватэры і жылыя дамы. І прычына часта заўсёды адна – небяспечнае карыстанне піратэхнічнымі вырабамі. Дарослыя нярэдка дазваляюць сабе ў стане алкагольнага ап'янення выкарыстоўваць піратэхніку, ігнаруючы патрабаванні бяспекі, падвяргаючы небяспецы сябе і сваіх блізкіх. Бацькі не надаюць важнасці гутаркам з дзецьмі пра небяспекі, якія ўтойваюць у сабе на выгляд бяскрыўдныя феерверкі і хлапушкі.

## УВАГА!!!

Піратэхнічныя вырабы абавязкова павінны мець сертыфікат якасці і інструкцыю па ўжыванні на рускай мове. Калі іх няма, то устрымайцеся ад пакупкі. Неабходныя тлумачэнні па іх выкарыстанні павінен даць прадавец.

Ніякая піратэхніка, акрамя бенгальскіх агнёў і хлапушак, не павінна выкарыстоўвацца ні ў кватэры, ні на балконе, таму што існуе вялікая небяспека ўзнікнення пажару або выбуху.

Перад пачаткам выкарыстання уважліва азнаёмцеся з інструкцыяй і строга яе выконвайце.

І яшчэ адно правіла: прадаваць піратэхніку дзецям да 15 гадоў - забаронена. Феерверкі можна запускаць толькі дарослым !!!!

# Асцярожна, тонкі лёд! Правілы паводзін на лёдзе.




Чалавеку дастаткова правесці 15 хвілін у халоднай вадзе, і ўсё можа скончыцца вельмі і вельмі дрэнна. Пры тэмпературы вады ад 0 да -2 °C смяротны зыход можа наступіць і пасля 10 хвілін.

Патэнцыйныя ахвяры - аматары падлёднай рыбалкі. Акрамя рыбакоў, часта тонуць і дзеці. Па статыстыцы трэцяя частка ахвяраў знаходзіцца ў стане алкагольнага ап'янення. Аднак на 100% ад экстрэмальнага купання не застрахаваны ніхто, таму варта выконваць нескладаныя правілы бяспекі.

**Бацькі, абавязкова пагаварыце са сваімі дзецьмі аб небяспецы гульняў на лёдзе, строга забараніце ім выходзіць на лёд!**

## Як выбрацца з палонкі і дапамагчы таварышу: рэкамендацыі ад выратавальнікаў.

1. Не панікуйце. Выратаванне на 90% залежыць ад упэўненасці і псіхалагічнага стану чалавека, які праваліўся пад ваду. Калі паблізу ёсць людзі - клічце на дапамогу.
2. Старайцеся не правальвацца пад ваду з галавой.
3. Перамяшчайцеся да таго краю палонкі, адкуль ідзе плынь. Дабраўшыся, паспрабуйце налегчы грудзьмі на край лёду і, закінуўшы нагу, выбрацца на лёд. Нават калі лёд абломваецца, не пакідайце спробаў выбрацца наверх.
4. Калі асноўная частка тулава апынецца на лёдзе, адпаўзіце або адкаціцеся далей ад палонкі. Павольна і асцярожна паўзіце да бяспечнага месца, вяртайцеся назад па сваіх слядах.
5. Выбраўшыся з вады, рухайцеся і рабіце сілавыя практыкаванні. Калі ёсць магчымасць – выклікайце хуткую дапамогу.

Рэдкалегія: вучні 8 класа, Баркоўская Г.І., класны кіраўнік 8 класа.